

# Урок 100

Разгледзь, як выканалі множанне на двухзначны лік. Параўнай розныя спосабы запісу вылічэнняў.

$$36 \cdot 24 = 36 \cdot (20 + 4) = 36 \cdot 20 + 36 \cdot 4 = 864$$






1. Множу першы множнік 36 на лік адзінак другога множніка — 4. Атрымліваю **першы няпоўны здабытак** — 144 адзінкі.
2. Множу першы множнік 36 на лік дзясяткаў другога множніка — 2. Атрымліваю **другі няпоўны здабытак** — 72 дзясяткі.
3. Складваю атрыманыя няпоўныя здабыткі.
4. Чытаю адказ — 864.

**1.** Вылічы ў слупок.

| | | | |
|---|---|---|---|
| $92 \cdot 68$ | $86 \cdot 46$ | $68 \cdot 66$ | $58 \cdot 84$ |
| $56 \cdot 17$ | $63 \cdot 22$ | $39 \cdot 39$ | $19 \cdot 78$ |

**2.** Запішы выразы і знайдзі іх значэнні.
- Лік 151 515 паменшылі на здабытак лікаў 4213 і 6.
- Здабытак лікаў 5 і 68 321 паменшылі на 99 999.
- Суму лікаў 1083 і 890 павялічылі ў 400 разоў.
- Рознасць лікаў 456 337 і 12 337 паменшылі ў 40 разоў.

**3.** Выканай дзяленне з астачай.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 429 : 20 | 520 : 30 | 310 921 : 50 | 6 : 40 |

**4.** Параўнай.

| | | |
|---|---|---|
| 4 т ? 400 ц | 3 сут. ? 70 г | 5 га ? 500 а |
| 7 ц ? 700 кг | 4 г. ? 50 мес. | 6 $м^2$ ? 120 $дм^2$ |



Правообладатель Национальный институт образования



## Урок 100

**5.** Складзі і рашы задачу.

| Умяшчальнасць адной каністры, л | Колькасць каністраў, шт. | Умяшчальнасць усіх каністраў, л |
| --- | --- | --- |
| аднолькавая | 5 | ? } 240 |
| | 7 | ? |

**6.** За 2 алоўкі і 3 сшыткі заплацілі 2 р. 40 к., а за 1 аловак і 3 сшыткі — 2 р. 10 к. Знайдзі цану алоўка і сшытка.

**7.** З сапсаванага крана ў секунду капаюць тры кроплі вады. У выніку за 20 мін можа напоўніцца вадой адна шклянка. Колькі шклянак вады можа выцечы з сапсаванага крана за гадзіну?

**8.** Каложская царква ў горадзе Гродне была пабудавана ў 12-м стагоддзі. Вызнач прыблізны ўзрост гэтай царквы ў стагоддзях. Вылічы плошчу падлогі гэтай царквы, калі яна мае форму прамавугольніка з даўжынямі старон, роўнымі 22 м і 13 м.



**?** Дапоўні сказы.
«Пры множанні ў слупок ліку 35 на лік 46 спачатку 35 множу на ..., а потым 35 множу на ... . Атрыманыя ... здабыткі ...».

**1.** Вылічы ў слупок.
62 · 73 54 · 37 39 · 21 44 · 42

**2.** За 13 паветраных шароў заплацілі 1 р. 10 к. Які кошт 39 такіх шароў?



Правообладатель Национальный институт образования